Голас душы
Яднанне ў любові
№ 2 (538)
Субота, 11 сакавіка 2017 г.
Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ МІТРАПАЛІТА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА ВЯЛІКІ ПОСТ



Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры!

1. Юбілей 100-годдзя фацімскіх аб’яўленняў, які сёлета Каталіцкі Касцёл у Беларусі адзначае разам з паўсюдным Касцёлам, заклікае нас да навяртання. Нагадвае аб гэтым і дэвіз пастырскага года: «Фацімскія аб’яўленні – шлях да навяртання».

Падчас сваіх аб’яўленняў у Фаціме ўмовай да нармальнага шчаслівага жыцця Марыя назвала малітву і навяртанне.Яе заклік не страціў сваёй актуальнасці і ў наш час.

На пачатак Вялікага посту Касцёл, паўтараючы першыя словы, з якімі Езус звярнуўся да сваіх слухачоў – «Кайцеся і верце ў Евангелле» (Мк 1, 15), таксама заклікае нас да навяртання. Хрысціянін пакліканы вярнуцца да Бога ўсім сэрцам (пар. Ёэл 2, 12), каб не задавальняцца пасрэдным стылем жыцця, а ўзрастаць у адносінах з Богам, як кажа папа Францішак ва ўступе да сёлетняга паслання на Вялікі пост (пар. ПВП-17).

*Працяг на стар. 2*

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ МІТРАПАЛІТА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА ВЯЛІКІ ПОСТ

*Працяг. Пачатак на стар. 1*

Маючы на ўвазе тое, што новы літургічны перыяд, які распачынаецца ў Папяльцовую сераду, па сваёй сутнасці з’яўляецца найбольш адпаведным часам для пакаяння і навяртання, нам неабходна засяродзіцца на гэтай праблеме сучаснага чалавека з мэтай атрымаць патрэбную для збаўлення Божую ласку.

2. На пачатку нашых разважанняў трэба прызнаць, што самай вялікай перашкодай у працэсе навяртання ў наш час з’яўляецца страта слушнага разумення граху і ідэя самадастатковасці.

Яна, між іншым, праяўляецца ў ідэалізацыі і выбельванні саміх сябе да такой ступені, што знешні выгляд чалавека закрывае яго грэшнае нутро і паслядоўна становіцца перашкодай для пакаяння і духоўнага дасканалення. У выніку ўзнікае пачуццё бязгрэшнасці і невінаватасці. Замест таго, каб прызнаць сваю віну і выйсці на шлях пакаяння і навяртання, мы апраўдваем сябе з мэтай абараніць ідэальны вобраз нашай асобы. Гэты сімптом становіцца хваробай нашага часу.

Калі мы нават і прызнаём свае памылкі, то імкнёмся шукаць алібі з мэтай аднавіць наш імідж ва ўласных вачах і ў вачах іншых людзей. Мы кажам, што ўчынілі той ці іншы грэх, але адначасова падкрэсліваем, што ён не прынёс нікому шкоды і з-за яго ніхто не пацярпеў, або гэта здарылася даўно і цяпер не мае ніякага значэння, бо пасля гэтага мы зрабілі многа добрых учынкаў і маліліся, паехалі, напрыклад, у пілігрымку ў Святую Зямлю, наведалі пусты гроб Пана, былі ў Рыме на агульнай аўдыенцыі са Святым Айцом, які нас благаславіў і г. д.

Такое мысленне памылковае, бо вядзе да наступнай высновы: «Са сваімі слабасцямі я даю рады сам». Яно таксама пацвярджае вялікі духоўны крызіс, у аснове якога знаходзіцца ідэя антрапацэнтрызму. Сучасны чалавек ставіць сябе, а не Хрыста, на першае месца і забываецца пра хрыстацэнтрызм.

3. Бог жадае чагосьці іншага. Успомнім словы Езуса Хрыста, што без Яго мы не можам нічога зрабіць (пар. Ян 15, 5).

Успомнім евангельскую гісторыю пра марнатраўнага сына, які зразумеў свой грэх і сказаў: устану і пайду да майго бацькі і скажу, што зграшыў супраць яго і Бога. Ён так і ўчыніў, бо ведаў, што не дастаткова толькі ўсвядоміць сабе сваю грэшнасць, але неабходна яе прадставіць Богу, бо толькі Ён можа вылечыць гэтую духоўную хваробу (пар. Лк 15, 1-32).

Марнатраўны сын не ідэалізаваў сябе, не апраўдваўся, што зграшыў даўно, але з жалем канстатаваў свой грэх (пар. Лк 15, 21).

У той жа час духоўная самаідэалізацыя вядзе да абсалютызацыі нашай волі і супрацьпастаўлення яе Божай волі, што ў сваю чаргу становіцца прычынай духоўнай паталогіі і развіцця пачуцця самадастатковасці, і таксама перашкаджае ва ўрэгуляванні нашых адносін з Богам. У сваёй ганарлівасці мы не адважваемся прызнаць нашае духоўнае паражэнне і няжыццяздольнасць створанага намі нашага духоўнага ідала і ўласнага абагаўлення, каб звярнуцца па дапамогу да Бога.

4. У такой складанай маральнай сітуацыі мы нярэдка стараемся заспакоіць голас сумлення справамі дабрачыннасці, якая, калі мы не кіруемся ўзнёслымі духоўнымі ідэаламі міласэрнасці, становіцца філантропіяй. Гэта не што іншае, як маскіроўка з мэтай схаваць нашыя духоўныя недахопы і прадставіць сябе перад іншымі шляхетнай асобай, што не спрыяе нашаму духоўнаму ўдасканальванню і не вядзе да вечнага шчасця.

Адзін аповед распавядае пра тое, як вельмі багаты і адначасова амаральны чалавек пасля смерці трапіў у пекла. Ён быў не задаволены і казаў Св. Пятру, што яго месца ў небе, бо ён збудаваў святыню. Пётр пайшоў да Бога і спытаў, што чыніць у такім выпадку. Бог адказаў: «Спытай, колькі каштавала пабудова святыні – і мы яму вернем грошы, а ён застанецца ў тым месцы, якое заслужыў сваім жыццём». Мараль гэтага аповеду ў тым, што нельга адкупіцца ад грахоў, з іх трэба паспавядацца. Гэта азначае, што патрэбна навяртанне.

Зразумела, што гэта ўсё не адмаўляе неабходнасці дабрачыннасці, бо бедных заўсёды будзем мець, як кажа Хрыстус (пар. Ян 12, 8). Аднак, як вучыць папа Бэнэдыкт XVI, дабрачыннасць не можа быць толькі формай сацыяльнай падтрымкі, яна заўсёды павінна захоўваць сваю высакароднасць з мэтай сведчыць пра Хрыста (пар. DCE 31).

5. Дзе шукаць паратунку ў сітуацыі ідэалогіі духоўнай самадастатковасці і маральнага заняпаду? Хто дапаможа? Ці ёсць надзея?

Яна ёсць і яна ў Езусе Хрысце, які нас збавіў праз сваю Пасхальную таямніцу крыжовай смерці і ўваскрасення і які ў сваёй бязмежнай міласэрнасці не пакідае нас адных.

*Працяг на стар. 3*

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ МІТРАПАЛІТА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА ВЯЛІКІ ПОСТ

*Працяг. Пачатак на стар. 1-2*

У сакрамэнце пакаяння Ён працягвае нам сваю руку дапамогі. Для гэтага найперш неабходна перамагчы самога сябе, адмовіцца ад ідэі самадастатковасці і ідэалізацыі самога сябе.

Не трэба пакланяцца самому сабе і сфармаванаму намі нашаму «я», якое мы баімся страціць. Сваімі сіламі мы не дасягнём вечнага Валадарства, бо на шляху да яго знаходзіцца злы дух. Аднак Хрыстус перамог яго і адчыніў нам брамы неба. Трэба толькі скарыстацца плёнамі Яго перамогі.

6. Мы вызвалены для свабоды дзяцей Божых (пар. Гал 5, 13) і такімі павінны быць. Але ці мы імі з’яўляемся? Трэба памятаць аб тым, што чалавек не мае ўнутранай свабоды, калі толькі з-за баязлівасці, а не з любові, захоўвае Божы закон.

Бог дазваляе спакусы. Але ніколі не дапусціць тыя, якія з Яго дапамогай мы не зможам перамагчы. У сваёй слабасці мы грашым. Гэта па-чалавечаму.

Аднак заставацца ў граху – гэта ўжо д’ябальская справа. Таму, усведамляючы сваю слабасць і грэшнасць, нам трэба шукаць паратунку ў бязмежнай Божай міласэрнасці. А для гэтага неабходна выказаць сваю любоў да міласэрнага Езуса, у якім наша надзея. Калі гэтага не будзе, то ўсе нашыя змаганні будуць падобны да змаганняў міфічнага Сізіфа, які коціць камень на гару і зрываецца ўніз – і так без канца.

Таму, пакуль мы не ўсвядомім сваю грэшнасць, не зможам уступіць на шлях навяртання. Такі стан душы – гэта наша духоўная восень. Як вядома, прырода на восень замірае. А мы пакліканы да жыцця, таму духоўную восень неабходна замяніць на духоўную вясну. Зрабіць гэта можна толькі праз пакаянне, якое вызваляе нас і адраджае. Бог нічога ў нас не просіць і нічога не жадае, акрамя прызнання ў грэшнасці.

7. Аднойчы пустэльнік, у якога была слава святога, сустрэўся з вельмі багатым, шчодрым маладым чалавекам, які не захоўваў Божы закон. Ён, падобна фарысею, хваліўся сваім цнатлівым жыццём (пар. Лк 18, 11-12), асабліва тым, што многа дапамагае іншым. Старац выслухаў яго і ў адказ сказаў, што і ён грэшны і патрабуе навяртання.

Пры гэтым ён падкрэсліў небяспеку самапакланення, калі самазадаволены чалавек не бачыць сваіх грахоў. Гэта не робіць яго больш цнатлівым, нават калі ён і здзяйсняе добрыя ўчынкі. Як вядома, да цнатлівага жыцця вядзе навяртанне.

Далей старац сказаў маладому чалавеку: «Добра. Ты можаш працягваць жыць не паводле Божай волі, але сваёй! Але што далей?» Гэтыя словы так моцна запалі ў яго сэрца і так узрушылі яго, што ён задумаўся над сваім духоўным жыццём і вярнуўся на шлях навяртання.

Гэты прыклад паказвае, што, будучы задаволенымі сабою, як быццам заключанымі ў вязніцу самадастатковасці і самалюбства, мы не карыстаемся Божай ласкай і наследуем выключна свецкі стыль жыцця. Без пакаяння мы губляем унутраную свабоду, якой нам так не хапае. Прызнанне ж грэшнасці становіцца пачаткам навяртання і разумення таго, што мы самі без Божай дапамогі нічога не зможам зрабіць, бо з грахоўнага рабства нас можа вызваліць толькі Хрыстус.

8. Распачынаючы Вялікі пост – час пакаяння і навяртання – добра паглядзець на гэту праблему праз прызму вучэння Святога Пісання. Яно дае нам шмат прыкладаў барацьбы паміж дабром і злом. Успомнім некаторыя з іх.

Хрыстус на пустыні не паддаўся спакусам сатаны (пар. Мц 4, 1-11). Мытнік Левій стаў апосталам Мацвеем (пар. Мц 9, 9). Са святыні апраўданым выйшаў не ганарысты фарысей, а пакорны мытнік (пар. Лк 18, 9-14). Хрыстус не папракаў чужаложніцу, а сказаў ёй больш не грашыць (пар. Ян 8, 11). Злачынцу, які шкадаваў за свае грахі, Езус на дрэве крыжа паабяцаў Божае Валадарства (пар. Лк 23, 39-43). Ганіцель Касцёла Саўл становіцца апосталам язычнікаў Паўлам (пар. Дз 22, 6-16).

Усё гэта падобна на скандал. Але гэта праўда бязмежнай Божай міласэрнасці, доступ да якой мае кожны, трэба толькі звярнуцца да яе ў сакрамэнце пакаяння. «Міласэрнасць аднаўляе і здзяйсняе адкупленне, бо гэта сустрэча двух сэрцаў: Божага сэрца, якое выходзіць насустрач сэрцу чалавека», як вучыць папа Францішак (ММ 16).

Каб напіцца вады з крыніцы на полі, неабходна стаць на калені. Падобна і тут, каб атрымаць Божую ласку, якая прабачае грахі, неабходна стаць на калені перад канфесіяналам, у якім ад імя Езуса і Ягонай моцай дзейнічае святар. Трэба стаць на калені і сказаць: «Я зграшыў». Толькі тады мы зможам напіцца жыццядайнай вады Божай ласкі, а наш грэх зменіцца ў радасць.

*Працяг на стар. 4*

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ МІТРАПАЛІТА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА ВЯЛІКІ ПОСТ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1-3*

Нездарма падчас Пасхальнай вігіліі святар спявае пра шчаслівую віну Адама: «О, сапраўды абавязковым быў грэх Адама, бо яго згладзіла смерць Хрыста! О, шчаслівая віна, якую знішчыў такі вялікі Адкупіцель!»

9. Нагадваючы пра пакаянне, вельмі добра ўспомніць гісторыю навяртання марнатраўнага сына і гісторыю пракляцця Каіна, які забіў свайго брата Абеля.

Марнатраўны сын зразумеў свой грэх і прасіў прабачэння ў Бога і свайго бацькі, і атрымаў яго (пар. Лк 15, 21-24). Каін жа на пытанне Бога, дзе яго брат, адказаў, што не з'яўляецца яго вартаўніком. Ён не хацеў прызнацца ў сваім граху, і гэта стала яго трагедыяй (пар. Быц 4, 8-11).

Бог пакараў Каіна не за злачынства, а за няшчырасць. Трэба памятаць, што грэх – гэта адна справа, а непрыстойнасць – іншая. Тут гаворка не пра тое, што Бог імкнецца нас пакараць за наш грэх, а пра тое, што сам грэх карае нас.

Таксама не было б і першароднага граху, калі б Адам і Ева пасля таго, як з'елі плод з забароненага дрэва, не схаваліся б ад Бога, а прызналіся ў граху (пар. Быц 3, 1-24).

У гэтым і ёсць сэнс падзення Адама і Евы. Яны не верылі ў тое, што Бог заўсёды застаецца міласэрным Айцом і што Ён дараваў бы ім нявернасць, калі б яны аб гэтым папрасілі. Замест гэтага яны дзейнічалі паводле свайго чалавечага менталітэту – апраўдвалі сябе і шукалі вінаватых. Яны нібы казалі: «Гэта Ты, Божа, вінаваты, бо не збярог нас ад падзення. Дзе Ты быў тады, калі сатана нас спакушаў, дзе быў, калі мы зрывалі забаронены плод, дзе быў, калі мы яго елі і г.д.» Праблема Адама і Евы ў тым, што яны не даверылі сябе Божай міласэрнасці.

10. У гэтым сэнсе павучальнай з'яўляецца гісторыя навяртання караля Давіда, які ўчыніў грэх чужаложства і забойства. Будучы каралём, ён пачаў жыць з Бэтшэбай, жонкай свайго военачальніка Урыі, і паслаў яго на немінучую смерць на поле бітвы (пар. 2 Сам 11, 2-17). У гэтым быў яго грэх, бо ён, выбраная Богам пярліна, упаў у грахоўнае балота.

Аднак, ап'янёны цялеснай юрлівасцю, ён не адчуваў гэтага. З ім адбывалася тое, што адбываецца з возчыкам брычкі: калі ён цвярозы, то і брычка едзе нармальна, калі п'яны – то хаатычна. Адносіны паміж возчыкам і брычкай з'яўляюцца прыкладам адносін паміж душой і целам. Калі душа не затоплена ў грэшным віры, то яна можа кантраляваць дзейнасць чалавека. Калі ж душа ап'янела ад граху, то траціць кантроль над целам. Так было і з каралём Давідам.

Пазнаць ягоны грэх Давіду дапамог прарок Натан. Ён распавёў яму гісторыю пра багатага чалавека, які забраў у беднага апошнюю авечку, каб падрыхтаваць абед для госця. Давід вельмі абурыўся і сказаў, што багаты чалавек паступіў несправядліва. Тады прарок Натан сказаў цару Давіду, што гэта ён той чалавек, які зрабіў зло. Прарок спытаў яго словамі самога Бога: «Я табе даў усё, і даў бы больш, калі б ты папрасіў. Чаму ты так паступіў?» Давід зразумеў свой грэх і сказаў, што зграшыў перад Богам (пар. 2 Сам 12, 1-13).

11. Дарагія браты і сёстры!

Распачынаючы Вялікі пост, дазволім Касцёлу дапамагчы нам убачыць наш грэх, падобна таму, як прарок Натан дапамог убачыць яго каралю Давіду, каб мы пазналі яго і прасілі ў Бога прабачэння, і тады будзем апраўданыя. Няхай гэты час стане часам міласэрнасці для кожнага грэшніка, каб ён нястомна прасіў аб прабачэнні і адчуў руку Айца, які заўсёды нас вітае і туліць да сябе, як кажа папа Францішак (пар. ММ 21).

Давяраючы ўсіх вас Марыі, Маці міласэрнасці, якая ў сваім фацімскім пасланні заклікае да навяртання і вядзе да свайго Сына Езуса Хрыста — лекара душаў, на духоўную працу над сабой і адкрыццё на Божую міласэрнасць у гэты час ласкі перамены нашага жыцця ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, † і Сына, і Духа Святога. Амэн.

*Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч*
*Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі*
*Паводле Catholic.by*



# БУДЗЬЦЕ ДУХОЎНА АБЫЯКАВЫМІ ДА МАТЭРЫЯЛЬНЫХ СПРАЎ

*28 лютага 2017 г. у касцёле Св. Сымона і Св. Алены прайшла пастырская сустрэча для святароў і кансэкраваных асобаў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. Узначаліў сустрэчу Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. У сустрэчы прынялі ўдзел таксама дапаможныя біскупы архідыяцэзіі Юрый Касабуцкі і Аляксандр Яшэўскі SDB*

У гаміліі Мітрапаліт Тадэвуш нагадаў, што вучэнне Хрыста канцэнтруецца не на матэрыяльных каштоўнасцях, а на духоўных, на выкананні не сваёй волі, а Божай.

«Сённяшняе Евангелле – гэта Божае слова найперш для духоўных асобаў: святароў, законнікаў і законніц. Бо яны, падобна апосталам, добравольна адмовіліся ад сямейнага жыцця на карысць служэння людзям у парафіяльных і іншых супольнасцях, каб несці ім праўду Евангелля і вучыць паслухмянасці Божай волі. Гэта тое, што мы называем пакліканнем да святарскага і кансэкраванага жыцця. Жывучы і служачы паводле патрабаванняў Касцёла, а для кансэкраваных асобаў таксама і паводле евангельскіх парадаў, будучы інструментамі ў руках Езуса, мы не павінны шукаць сваёй карысці, але дапамагаць людзям ісці шляхам збаўлення», – адзначыў іерарх.




Таксама, як падкрэсліў арцыпастыр, у Евангеллі гучыць перасцярога, якая датычыць і свецкіх вернікаў, – не засяроджвацца на матэрыяльных каштоўнасцях, «што ў наш час з’яўляецца галаўным болем чалавека». «Свет і яго справы пройдуць, а заўсёды актуальнае і дзейснае Божае слова застанецца. Менавіта яно дапамагае ў будаванні справядлівага грамадства на гэтай зямлі і вядзе ў шчаслівую вечнасць», – дадаў Мітрапаліт Тадэвуш.

«Святы Ігнацый Лаёла заклікае нас, святароў, законнікаў і законніц, а таксама свецкіх вернікаў, быць духоўна абыякавымі да матэрыяльных спраў. Яны не павінны стаць для нас богам. Наадварот, мы пакліканы любіць людзей і карыстацца рэчамі ў такой ступені, у якой яны вядуць да Бога», – падкрэсліў іерарх.

Арцыпастыр нагадаў, што еднасць з Хрыстом нясе свабоду, мір, радасць, спакой і вечнае жыццё. «Хіба ж гэта не добры выбар? Несумненна, добры. Пойдзем жа, дарагія святары і кансэкраваныя асобы, разам з Езусам да нашых вернікаў, каб і яны зрабілі такі самы выбар – першае месца аддалі Богу, у якім нашае збаўленне», – заключыў Мітрапаліт Тадэвуш.

*Паводле Catholic.by*









# КАСЦЁЛ ЗАКЛІКАЕ НАС СПАЛІЦЬ ГРЭХ

*«Падчас Вялікага посту Касцёл заклікае нас спаліць грэх і ўсё, што перашкаджае духоўнаму развіццю», – такой думкай распачаў гамілію Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч падчас Святой Імшы ў Папяльцовую сераду 1 сакавіка 2017 г. – першы дзень Вялікага посту*

Іерарх указаў на сімвалізм набажэнства ў Папяльцовую сераду, калі галовы пасыпаюць попелам: цела пасля смерці чалавека раскладзецца, а душа застанецца, і «яе лёс будзе залежаць ад нашага зямнога жыцця, ад яго духоўнай якасці». Праз гэты напамін, як сцвердзіў арцыпастыр, Касцёл адначасова падкрэслівае, што чалавека чакае ўваскрашэнне.

«Мы павінны сачыць за здароўем не толькі цела, але і душы – чыніць свайго роду духоўны “check up”, – адзначыў Мітрапаліт Тадэвуш. – І гэта заданне Вялікага посту, які з’яўляецца часам самакантролю. Падчас гэтай праверкі мы павінны праз прызму Святога Пісання і вучэння Касцёла вельмі ўважліва паглядзець на сябе, каб заўважыць усе недахопы нашага духоўнага здароўя».

Іерарх нагадаў, што не ўсе дасягаюць вечнага жыцця ў Валадарстве Нябесным, хоць усе і прызначаны для яго. «У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці ёсць такія рэчы ці справы, якія не дазваляюць нам дасягнуць неба? Так, яны ёсць. Гэта грэх і нашы дрэнныя схільнасці», – падкрэсліў арцыбіскуп.

На заканчэнне гаміліі Мітрапаліт Тадэвуш прапанаваў практычныя парады, якія дапамогуць як мага больш плённа выканаць галоўнае заданне Вялікага посту – усвядоміць сваю грэшнасць і з жалем вызнаць свае грахі ў сакрамэнце пакаяння. Іерарх прапанаваў задумацца над наступнымі пытаннямі: ці штодзённа мы молімся, ці кожную нядзелю і свята прымаем удзел у Св. Імшы, ці церпялівыя, ці ахвотна дапамагаем патрабуючым, ці прабачаем, ці не ставім матэрыяльных рэчаў вышэй за духоўныя, ці не лянуемся, ці справядлівыя ў адносінах да іншых людзей, ці клапоцімся аб рэлігійным выхаванні дзяцей і моладзі, ці стараемся ўзрасцаць у цнотах і ў веры, ці не адзначаемся пасрэднасцю, ці баронім сям’ю і Божы дар жыцця, ці часта прыступаем да споведзі і святой Камуніі?..

«Спіс гэтых пытанняў можна працягваць доўга. Падчас Вялікага посту неабходна на іх адказаць – шчыра і сумленна», – дадаў арцыпастыр.

Па традыцыі падчас святой Імшы адбылося пасыпанне галоваў пеплам — на знак пакаяння і тленнасці зямнога жыцця. «Прымаючы на свае галовы попел, даверымся бязмежнай Божай міласэрнасці, каб гэты Вялікі пост сапраўды стаў часам пазнання нашага духоўнага здароўя, часам навяртання і часам духоўнага росту», – пажадаў іерарх.

*Фота Віталія Палінеўскага*
*Паводле Catholic.by*



# У ЧЫРВОНЫМ КАСЦЁЛЕ СУСТРЭЛІ МАЦІ БОЖУЮ ФАЦІМСКУЮ

*У межах падрыхтоўкі да 100-годдзя святкавання Фацімскіх аб'яўленняў Маці Божай па касцёлах Беларусі праходзіць перэгрынацыя (падарожжа) фігуры Маці Божай Фацімскай. 3 лютага 2017 г. фігуру сустрэлі ў мінскай парафіі Св. Сымона і Св. Алены*



4 кастрычніка 2016 г. Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч блаславіў фігуру ў партугальскай Фаціме. 16 кастрычніка распачалася яе перэгрынацыя па касцёлах Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі.

Фацімскія аб'яўленні, якія прызнаныя Каталіцкім Касцёлам сапраўдным цудам, адбываліся у траўні-кастрычніку 1917 г. у партугальскім мястэчку Фаціма, калі тром дзецям шматразова з'яўлялася Дзева Марыя, передаючы ім заклікі і прароцтвы, у тым ліку наконт навяртання Расіі, часткай якой у 1917 г. была і Беларусь, без якога Расія можа распаўсюдзіць па свеце свае грахі, выклікаючы войны і ганенні на Царкву.







# КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА КНІЖЦЫ «СВЯТЫ ШАРБЕЛЬ. МАНАХ-ЧУДАТВОРАЦ»

*У бібліятэцы Чырвонага касцёла адбылася чытацкая канферэнцыя па кнізе, укладзенай кс. Уладыславам Завальнюком «Святой Шарбель. Монах-чудотворец»*




Брашура, выдадзеная ў 2016 г., знаёміць з жыццём і малітоўным подзвігам ліванскага святога, яго цудатварэннямі. Бібліятэкар, спадарыня Галіна, захапляльна распавяла пра дзяцінства і юнацтва святога, якога называюць духоўным братам Св. Серафіма Сароўскага, шануюць як каталікі, так і праваслаўныя вернікі ва многіх краінах.

Святы Шарбель Махнуф нарадзіўся 8 мая 1828 г. у хрысціянскай сям'і ў Бекаа-Кафра (паўночны Ліван) і пры хросце атрымаў імя Юсэф. У 23 гады ён уступіў у кляштар святога Марона ў Анаі, дзе атрымаў манаскае імя Шарбель, што перакладаецца з арабскай як «шар» – «цар» і «бель» – «Бог». Ён атрымаў святарскі сан 23 ліпеня 1859 г. У кляштары ён прысвяціў сябе малітве, працы і духоўным практыкам. У 1875 г. айцец Шарбель распачаў пустэльніцкае жыццё, у якім знаходзіўся 23 гады. Памёр а. Шарбель у вігілію Божага нараджэння ў 1898 г. Пасля пахавання над яго магілаю з'явілася яркае свячэнне, якое трымалася напрацягу тыдня.

Цела святога праз гады засталося нятленным і выдзяляе ружовую сукравіцу. Зафіксаваныя тысячы выпадкаў цудоўных ацаленняў праз заступніцтва святога. 5 снежня 1965 г. ён быў прылічаны да ліку блажэнных. Кананізацыя адбылася 9 кастрычніка 1977 г. У горад Аная прыязджаюць са ўсяго свету багасловы, іерархі Каталіцкай Царквы, лекары, паломнікі.

Сястра Валянціна пранікнёна распавяла пра выпадкі ацаленняў ля труны святога, якія адлюстраваны ў літаратуры. «Айцец Шарбель быў чалавекам вельмі сціплага жыцця, ён ведаў тайны чалавечых душ лепш, чым лекары. Ён вучыў ніводнай хвіліны жыцця не праводзіць марна, а трываць у фізічнай і духоўнай працы і навуцы».

Сястра Аліна прачытала вершы, прысвечаныя святому Шарбелю, і малітву да яго. Мэта кнігі, выдадзенай пры падтрымцы Касцёла, – пазнаёміць вернікаў з духоўнай спадчынай святах ва ўсім свеце, у дадзеным выпадку – з хрысціянскімі традыцыямі на Усходзе. Папярэднікам святога Шарбеля быў святы Марон, які жыў у 5 стагодзі ў Сірыі.

У старазапаветную эпоху Ліван славіўся магутнымі кедрамі і лясамі. Цар Саламон атрымліваў кедры для будаўніцтва храма. Кнігу ксяндза Уладзіслава завяршае легенда пра тысячагадовыя кедры, што ўзраслі на Ліванскай зямлі. Усе яны хацелі паслужыць вялікай мэце. Дрэва аднаго з іх стала калыскай Збавіцеля, гронка іншага – сталом для Тайнай вячэры, а з трэцяга кедра быў выраблены крыж, на якім Госпад аддаў сябе ў ахвяру за ўсіх людзей.




У бібліятэцы імя Адама Міцкевіча Мінскага Чырвонага касцёла можна знайсці шмат хрысціянскай і мастацкай літаратуры на розных мовах. Запрашаем усіх жадаючых.

*Эла Дзвінская*
*Паводле kryniсa.info*

# ДЗЯЛІЛІЦЦА ВЕРАЙ ПРАЗ СТАРОНКІ КНІГІ І ЧАСОПІСА

*26 лютага 2017 г. пасля Імшы а 15-й гадзіне ў касцёле Св. Сымона і Св. Алены выступіла пісьменніца Ірына Жарнасек, рэдактарка каталіцкага часопіса «Маленькі рыцар Беззаганнай»*

Яна скіравала свой выступ да навучэнцаў нядзельнай школы, іх бацькоў і катэхэтаў. Сёлета «Маленькаму рыцару» спаўняецца 20 гадоў. Сам часопіс для дарослых «Рыцар Беззаганнай» быў фундаваны апекуном пісьменнікаў і журналістаў святым Максімільянам Кольбэ у 20-я гады мінулага стагоддзя ў Гародні.

Пачынаўся сучасны «Маленькі рыцар Беззаганнай» са старонкі ў часопісе «Ave Maria», якую вяла Ірына Францаўна Жарнасек. Ілюстрацыі да выпускаў маляваў яе сын Аляксандр. Спадарыня Ірына з любоўю да дзяцей імкнулася распавесці ім пра Хрыста. Стыль адроджанага часопіса выпрацаваўся не адразу, а праз стварэнне апавяданняў, збор вершаў і дзіцячых малюнкаў, допісаў юных чытачоў, якія выказалі жаданне распавесці пра свае мясцовыя храмы, традыцыі веры ў сваіх сем’ях.

Пісьменніца і сёння сябруе з дзіцячым домам у Друі, прыязджае туды з падарункамі і асобнікамі часопіса. Падчас размовы з дзецьмі яна старалася зацікавіць іх дасылаць ў часопіс свае творы, а бацькоў – выпісваць ці набываць дзецям выданне, на стронках якога святары на сучасных прыкладах тлумачаць дзецям сэнс Божых прыказанняў. Яна папрасіла дзяцей не забываць пра малітву да Бога і Маці Божай за сваіх родных, краіну і ўвесь свет.

Ірына Францаўна распавяла пра свае кнігі прозы «Ліст да сына», «Гульні над студняй», «Гадара», аповесць-казку «Спрэчка анёлаў». Старэйшы сын спадарыні Ірыны, Аляксандр, скончыў мастацкую школу і марыў быць мастаком. Але пасля пілігрымкі ў Будслаў ён перамяніў свае рашэнне. Пасля заканчэня семінарыі ён далучыўся да айцоў-марыянаў і зараз служыць у касцёле Св. Язэпа ў Воршы і арганізуе там шматлікія рэкалекцыі, сужэнскія сустрэчы, «вінаграднікі» і іншыя імпрэзы, увесь час прысвячае сваім парафіянам. Матуля адчувае, што сын годна служыць Богу і людзям.

Пісьменніца звярнула ўвагу дзяцей на тое, што ў жыцці пастаянна ідзе выбар паміж дабром і злом, і варта рабіць свой выбар менавіта на карысць дабра.Такі выбар зрабілі героі яе кнігі «Будзь воля Твая» – росіцкія святары-марыяне Антоні Ляшчэвіч і Юры Кашыра. Калі вёска Росіца падчас карніцкай аперацыі фашыстаў супраць партызанаў была аточаная і яе насельнікі былі замкнутыя ў будынку касцёла і гаспадарчых забудовах, толькі два чалавекі мелі права пакінуць тэрыторыю вёскі – гэта былі святары. Але яны вырашылі паклапаціцца пра лёс тых, каго можна вызваліць, і дапамаглі некаторым сёстрам пазбегнуць спалення ці высылкі ў канцлагер. Святары-марыяне засталіся з жыхарамі вёскі. Яны выконвалі свае абавязкі: адпраўлялі Святую Імшу, удзялялі Камунію, спавядалі, хрысцілі дзяцей і дарослых, благаслаўлялі, суцяшалі тых, хто быў у роспачы, прыносілі дзецям хлеб. У лютым 1943 года яны прынялі пакутніцкую смерць разам з і іншымі людзьмі.

Праз гады пісьменніца сустракалася з асобамі, якім удалося выжыць у канцэнтрацыйных лагерах. Штогод яна наведвае памятныя дні ў Росіцы, дзе ўшаноўваецца памяць пакутнікаў. У савецкія часы гэтыя старонкі гісторыі былі невядомыя, бо датычыліся менавіта подзвіга вернікаў. Пісьменніца палічыла сваім абавязкам распавесці сучаснікам аб падзеях ў сваім рамане «Будзь воля Твая». Пазнаёміцца з ім можна ў бібліятэцы імя А. Міцкевіча Чырвонага касцёла.

«Пані рэдактарка служыць Касцёлу і людзям высакародным мастацкім словам, і мы ёй вельмі ўдзячныя!»– адзначыў ксёндз-пробашч Уладыслаў Завальнюк.

*Эла Дзвінская*



# ПЫХА – САМЫ НІЗКІ ЎЗРОВЕНЬ МАРАЛЬНАГА ЗАНЯПАДУ

*«Новым пачаткам» і «шляхам, які вядзе да бяспечнай мэты – Пасхі Уваскрасення» назваў Вялікі пост папа Францішак. У сваім адмысловым пасланні на гэты літургічны перыяд, апублікаваным 7 лютага 2017 г. у Ватыкане, Пантыфік нагадаў пра «святыя сродкі», прапанаваныя Касцёлам: пост, малітву і міласціну, а таксама Божае слова, якое ляжыць у аснове ўсяго*



Свае разважанні Пантыфік базуе на прыпавесці пра багатага чалавека і Лазара (Лк 16, 19–31). У гэтым апавяданні Бог прадстае не як хтосьці ананімны, а як той, хто мае выразныя рысы, аблічча, з кім трэба спалучыць сваю асабістую гісторыю. Гэта прыпавесць вучыць нас, што іншы чалавек – гэта дар; для яго трэба адчыніць дзверы нашага сэрца. І Вялікі пост – самы спрыяльны час для гэтага. Пантыфік заклікаў «сур'ёзна паставіцца да таго, што Евангелле кажа пра багацея».Прыпавесць бязлітасна падкрэслівае супярэчнасць, у якой знаходзіцца багаты чалавек.

Святое Пісанне нават не называе яго імя, у адрозненне ад беднага Лазара. У празмерным багацці гэтага чалавека прасочваецца сапсутасць грахом, заўважыў папа Францішак і назваў тры яе этапы: любоў да грошай, марная слава і пыха.

Срэбралюбства з'яўляецца асноўнай прычынай карупцыі і крыніцай зайздрасці, канфліктаў і падазрэнняў. Замест таго, каб быць інструментам для дабра, «грошы могуць падвергнуць нас і ўвесь свет эгаістычнай логіцы, якая не пакідае месца для любові і становіцца перашкодай на шляху да міру».

Прагнасць багатага чалавека робіць яго марным і пустым. Яго сутнасць – у знешнім выглядзе, у дэманстрацыі іншым, што ён можа сабе дазволіць. Папа назваў марную славу «маскай унутранай пустаты».

Але «самым нізкім узроўнем маральнага заняпаду» папа Францішак лічыць пыху. Багацей імітуе паводзіны Бога, забываючыся, што з'яўляецца смяротным чалавекам. «Для чалавека дэмаралізаванага прагнасцю багацця не існуе нічога, акрамя свайго ўласнага "я"; гэта свайго роду слепата: багаты чалавек не бачыць галоднага бедняка, які ляжыць побач. Гледзячы на гэтага чалавека, мы можам зразумець, чаму Евангелле так ясна асуджае любоў да грошай», – падсумаваў Святы Айцец.

І толькі сярод нягодаў таго свету багацей заўважыў Лазара і хацеў, каб той палегчыў яго пакуты, што было ўжо немагчымым. «На тым свеце вяртаецца справядлівасць і жыццёвыя пакуты ўраўнаважваюцца дабром», – заўважыў Папа. Прыпавесць працягваецца паведамленнем для ўсіх хрысціян. Калі багаты чалавек просіць Абрагама паслаць Лазара на гэты свет, каб той папярэдзіў яшчэ жывых братоў. Праайцец адказвае: «У іх ёсць Майсей і прарокі, няхай слухаюцца іх» (Лк 16, 29); «калі Майсея і прарокаў не слухаюцца, то, калі хто і ўваскрэсне з мёртвых, не паверыць» (Лк 16, 31).

Такім чынам, рэальнай праблемай багатага чалавека і крыніцай яго няшчасця, як падкрэсліў Францішак, з'яўляецца ігнараванне Божага слова.

Менавіта гэта прывяло яго да нелюбові да Бога і пагардлівага стаўлення да людзей. «Божае слова – гэта жывая сіла, здольная выклікаць навяртанне чалавечага сэрца і пераарыентаванне чалавека на Бога. Следствам закрыцця сэрца на дар прамаўляючага Бога з'яўляецца закрытасць сэрца на дар брата», – заўважыў Папа.

Ён нагадаў, што Вялікі пост з'яўляецца спрыяльным часам для духоўнага абнаўлення «ў сустрэчы з жывым Хрыстом у Яго слове, у сакрамэнтах і ў бліжнім». Пантыфік заклікаў у сваім пасланні да ўдзелу ў вялікапосных ініцыятывах, якія прапануюць многія касцёльныя арганізацыі ў розных частках свету. Гэта, на думку Святога Айца, дапаможа развіццю культуры сустрэчы ў адзінай чалавечай сям'і.

*Паводле Беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# «ПОМСТА – ВЫРАЗ НЯНАВІСЦІ І НАСІЛЛЯ»

*«Тое, чаму Хрыстус жадае навучыць нас, гэта дакладна адрозніваць справядлівасць ад помсты», – адзначыў папа Францішак падчас малітвы «Анёл Панскі» на плошчы Святога Пятра ў нядзелю 19 лютага 2017 г.*

Дарагія браты і сёстры, дзень добры!

У Евангеллі сённяшняй нядзелі (Мц 5, 38–48) – адным з тых тэкстаў, якія найлепш адлюстроўваюць хрысціянскую «рэвалюцыю», – Езус паказвае шлях сапраўднай праведнасці з дапамогаю закону любові, які вышэй за закон адплаты, што патрабуе «вока за вока і зуб за зуб». Гэтае старажытнае правіла наказвала накладаць на вінаватых пакаранне, адпаведнае нанесенай імі шкодзе: смерць таму, хто забіў; калецтва таму, хто кагосьці скалечыў і гэтак далей. Езус не патрабуе ад сваіх вучняў зносіць зло; больш за тое, Ён патрабуе рэагаваць на яго, але не злом у адказ, а дабром. Толькі такім чынам разрываецца ланцуг зла: адно зло цягне за сабою другое, тое – яшчэ наступнае… Калі разрываецца гэты ланцуг, усё сапраўды змяняецца. Насамрэч зло – гэта «пустка», адсутнасць дабра, а ніякую пустку немагчыма запоўніць з дапамогаю іншай пусткі, але толькі з дапамогаю «паўнаты», гэта значыць дабра. Карныя меры ніколі не вядуць да вырашэння канфліктаў. «Ты мне зрабіў гэта, і я табе зраблю тое ж»: такім чынам ніколі не вырашыць канфлікту, гэта таксама не па-хрысціянску.

Для Езуса адмаўленне ад насілля можа быць звязана нават з адмаўленнем ад законных правоў; Ён прыводзіць некалькі такіх прыкладаў: падставіць другую шчаку, аддаць свой плашч або ўласныя грошы, пайсці на іншыя ахвяры (пар. Мц 5, 39–42). Але гэтае адмаўленне не азначае, што патрабаванні справядлівасці можна не прызнаваць або аспрэчваць; не, наадварот, хрысціянская любоў, якая асаблівым чынам праяўляецца ў міласэрнасці, уяўляе сабою найвышэйшую форму здзяйснення справядлівасці.

Тое, чаму Хрыстус жадае навучыць нас, гэта дакладна адрозніваць справядлівасць ад помсты. Адрозніваць справядлівасць ад помсты. Помста ніколі не бывае справядлівай.

Мы маем права дамагацца справядлівасці; мы маем абавязак паступаць справядліва. Але нам забаронена помсціць або нейкім чынам заклікаць да помсты, што з’яўляецца выразам нянавісці і насілля.

Езус не мае намеру прапанаваць новы грамадзянскі лад, але, хутчэй, запаведзь любові да бліжняга, што ўключае ў сябе таксама любоў да ворагаў: «Любіце ворагаў вашых і маліцеся за тых, хто пераследуе вас» (Мц 5, 44). А гэта няпроста. Гэтыя словы нельга ўспрымаць як згоду на зло, учыненае ворагам, але як прапанову да вышэйшага погляду, да велікадушнага погляду, падобнага да погляду Нябеснага Айца, які, як кажа Езус, «загадвае сонцу свайму ўзыходзіць над дрэннымі і добрымі» (Мц 5, 45). Сапраўды, нават вораг – гэта таксама чалавечая асоба, створаная як такая паводле Божага вобразу, нават калі ў дадзены момант гэты вобраз скажоны нягоднымі паводзінамі.

Калі мы гаворым пра «ворагаў», мы не павінны думаць пра кагосьці невядомага, адрознага і далёкага ад нас; мы гаворым таксама пра нас саміх, бо і мы можам увайсці ў канфлікт з нашым бліжнім, часам з нашымі роднымі.

Як шмат варожасці ў сем’ях, як шмат! Задумаемся над гэтым. Ворагі – гэта таксама тыя, хто дрэнна кажа пра нас, хто на нас паклёпнічае і нас крыўдзіць. Гэта няпроста знесці. Усім ім мы пакліканыя адказваць дабром, якое таксама мае свае стратэгіі, натхнёныя любоўю.

Няхай Панна Марыя дапаможа нам наследаваць Хрыста, які сапраўды ўзвышае чалавечую годнасць і патрабуе ад нас жыць так, як павінны гэта рабіць дзеці нашага Нябеснага Айца. Няхай Яна дапаможа нам быць цярплівымі, весці дыялог, прабачаць і такім чынам ствараць еднасць, ствараць братэрства ў нашым штодзённым жыцці, перадусім у нашай сям’і.

*Дк. Мікола Гракаў*
*Паводле Catholic.by*



## СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА

_______ · _______ *2017 г. у* _______ · _______ *гадзін*

*у інтэнцыі* ________________________________________

______________________________________________

| 6 сакавіка Панядзелак | 7 сакавіка Аўторак | 8 сакавіка Серада | 9 сакавіка Чацвер | 10 сакавіка Пятніца | 11 сакавіка Субота | 12 сакавіка Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.00 – ✞<br>9.00 – *PL<br>12.00 – ✞<br>15.00– Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – * | 7.00 – *<br>9.00 – ✞PL<br>12.00 – *<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – ✞ | 7.00 – *<br>9.00 – *PL<br>12.00 – ✞<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – * | 7.00 – *<br>9.00 – *PL<br>12.00 – ✞<br>15.00– Вяч<br>17.00 – ✞<br>18.00 – lit<br>19.00 – * | 7.00 – *<br>9.00 – ✞<br>12.00 – ✞<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – ✞ | 8.00 – *<br>9.00 – ✞<br>12.00 – ✞<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – *<br>19.00 – ✞ | 8.00 – *<br>9.00 – *<br>11.00 – S<br>13.00 – *PL<br>15.00 –<br>15.00 – Вяч PL<br>16.00 – *<br>17.00 – *<br>19.00 – *<br>21.00 – * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым блаславенстве, апецы Маці Божай
✞– Святая Імша ў інтэнцыі памерлых
**скл** – Святая Імша складковая; **мл** – Святая Імша для моладзі; **слых** – Святая Імша для глуханямых
S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі
PL – Святая Імша на польскай мове
Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** — у капліцы Маці Божай Будслаўскай

**15.00** — Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

# АНОНСЫ

## 10–12 САКАВІКА ОРША ПРЫМАЕ РЭКАЛЕКЦЫІ «СУЖЭНСКІХ СУСТРЭЧ»

«Сужэнскія сустрэчы» праводзяць рэкалекцыі-ўікенды па аднаўленні і паглыбленні сужэнскай еднасці і любові. Бліжэйшы ўікенд адбудзецца 10–12 сакавіка ў Оршы ў парафіі Св. Юзафа па вул. Савецкай, 6.

Рэкалекцыі пачынаюцца ў пятніцу ў 18.00, а заканчваюцца ў нядзелю каля 15.00. Арганізатары забяспечваюць начлег і пасілак. Неабходны ўдзел абодвух сужэнцаў, без дзяцей і ва ўсёй праграме. Рэкалекцыі праводзяць аніматары – айцец-дамініканін з Віцебска і сужэнскія пары.

**У чым мэта такіх сустрэч?**

Мэта «Сужэнскіх сустрэч» – паглыбіць шлюбныя адносіны, дапамагчы мужу і жонцы лепш і глыбей разумець адно аднаго і асэнсаваць таямніцу іх шлюбу. Сужэнствам прапануецца такая форма дыялогу, якая, з аднаго боку, дазваляе мужу і жонцы глыбей пазнаць адно аднаго, а з другога – у выпадку непаразуменняў – дапаможа выходзіць з канфліктных сітуацый.

Сужэнскія пары і святары – аніматары руху – праз уласны досвед рыхтуюць удзельнікаў да самастойнай працы, гэта значыць да праўя дзення дыялогу.

Гэту працу муж і жонка праводзяць выключна ўдваіх. Уласная праца ўдзельнікаў з’яўляецца вельмі інтымнай і таму абавязкова застаецца таямніцай.

Сямейная пара можа за час правядзення рэкалекцый аднавіць свежасць узаемных пачуццяў, абнавіць ці нанова адбудаваць сваё адзінства. Праграма заснавана на сучасных ведах з галін псіхалогіі, камунікацыі і тэалогіі сям’і і складзена такім чынам, каб дазволіць кожнай пары паглядзець на сваё жыццё ў духу любові.

На «Сужэнскія Сустрэчы» прыходзяць людзі ў розным узросце, з розным досведам сямейнага жыцця, з розным узроўнем ведаў і рознай ступенню пабожнасці. Важна памятаць, што ад адносінаў мужа і жонкі ў вялікай ступені залежаць адносіны бацькоў з дзецьмі, са сваякамі, з іншымі людзьмі.

Больш падрабязную інфармацыю глядзіце на сайце www.suvstrechi.by.

Кантактныя нумары для запісу на рэкалекцыі:
+375 (29) 556-26-35, +375 (29) 140-84-56,
+375 (29) 782-14-66

*Іван і Алена Лубінскія*
*Паводле Catholic.by*

Голас душы № 2 (538) 2017. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 2016 г.
Заснавальнік: грамадскае аб’яднанне "Хрысціянскае таварыства міласэрднасці". Выдаецца з верасня 2000 г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, тэхнічны рэдактар – Кацярына Качарго.
Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: vlad_za@tut.by
www.chyrvony.by. Падпісана да друку 08.03.2017. Фармат 60×84 1/8. Надрукавана СТАА "Эвалайн", вул. Рыбалка, 9, оф. 23, 220033 г. Мінск.